ДУА “Кохanаўская сярэдняя школа імя І. П. Кожара Талачынскага раёна”

# Літаратурна - музычная кампазіцыя
# **“Мовай Коласа і Купалы”**



Распрацавала і правяла
Бераснякова Жанна Леанідаўна,
настаўнік беларускай
мовы і літаратуры вышэйшай
кваліфікацыйнай катэгорыі
zhanna.beresnyakova@gmail.com

Коханава, 2023

**Мэты:**
**развіваць цікавасць вучняў да творчасці Якуба Коласа і Янкі Купалы;**
**выхоўваць пачуццё любові і павагі да беларускага слова праз выкарыстанне музычных і літаратурных твораў;**
**падтрымоўваць творчы патэнцыял кожнага вучня.**

**Гучыць песня "Малітва"**
**Вядучы 1.** Добры дзень, паважаныя сябры!
**Вяд.2** Сёння, 21 лютага, увесь свет адзначае Дзень роднай мовы.
**Вядучы 1.** Вось і мы запрашаем вас на свята чароўнага беларускага слова ў паэзіі пісьменнікаў-юбіляраў, якія 140 год таму з'явіліся на свет, каб праславіць і ўзбагаціць родную мову беларускага народа.
**Вяд.2**
Як быццам розныя, зямля і неба,
Ды іх, паэтаў, адчужаць не трэба.
З вытокаў самабытных галасы
Зліваюцца ў адзін — народны голас:
**Вяд.1**
Без Коласа ў Купалы менш красы,
А без Купалы пабяднее Колас.



**Дэманстрацыя відэа "Два яблыкі з адной яблыні"**
**Вяд.2** Імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа вядомы кожнаму беларусу. Яны нарадзіліся ў адзін год. І мэту выбралі для сябе адну.
**Вяд 1** Гэтыя пісьменнікі пранеслі праз усё жыццё высокія ідэалы дабра і справядлівасці, аддалі народу свой талент і сэрца. Паслухайце неўміручы верш Я. Купалы, які доўгі час быў неафіцыйным гімнам Беларусі, у выкананні вучняў 9 "А" класа

**Вучні 9 класа чытаюць верш "А хто там ідзе"**

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.

А што яны нясуць на худых плячах,
На руках ў крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.

А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды ж нясуць на паказ сваю?
— На свет цэлы.

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца



**Вяд. 1** Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта.

**Вяд. 2** Нашы слаўныя песняры не раз сцвярджалі права беларусаў мовіць роднымі словамі. Пра гэта паслухайце верш Якуба Коласа, які прачытае Зубоўская Ульяна.

**Зубоўская Ульяна чытае верш Якуба Коласа “Беларуская мова”**

Завёз беларус сваю мову
У цёмную нетру, дуброву
І кажа: «Жыві тут адна,
Бо ты для мяне не гадна –
Куды мне падацца з табою?
Пісьменнікам будзь ты слугою
Ды зрэдку на шыльду залезь,
Сядзі, як на печы дзед, ногі звесь,
Калі не баішся стыда –
Марока з табою, бяда!»

Заплакала мова, стуліўшыся ў лесе,
Ды кліча Панаса, Максіма, Алеся,
Міхала, Пятруся, Кандрата, Івана.
Дык вось мне, якая, сыночкі, пашана.
Хіба ж то не здзекі? Хіба ж не блізнерства?
Ну, хоць бы адненькае мне міністэрства!
Павыпіхалі з усіх установаў –
Не ведаць бы гэтакіх дочак, сыноў!



**Вяд. 1** Колас і Купала сталі народнымі прарокамі, сцвердзілі сілу і моц беларускага слова. За ўсё гэта нашым слаўным песнярам самая глыбокая ўдзячнасць і пашана.
**Вяд. 2** А вось паэзію прыроды нашы класікі адчувалі з маленства. Замілаванасць прыгажосцю радзімага кутка Якуб Колас пранёс праз усё жыццё і з вялікай любоўю выказаў у радках неўміручай паэмы, якая пачынаецца так.
**Дэманстрацыя відэа "Мой родны кут" (на аснове мясцовага матэрыялу)**
**Вяд. 1** Яшчэ раз услухайцеся, паважаныя беларусы, у неўміручыя коласаўскія радкі з паэмы "Новая зямля"
**3 вучаніцы чытаюць урывак з раздзела "Леснікова пасада"**



Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,

К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку

Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя,—
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

Вясна, вясна! не для мяне ты!
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю,—
Цябе навек, вясна, хаваю.
Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.
Не раз яна, зрабіўшысь парам,
На крыллях сонца дойдзе к хмарам
Ды йзноў дажджом на рэчку сыдзе —
Ніхто з граніц сваіх не выйдзе,
З законаў, жыццем напісаных,
Або на дол спадзе ў туманах.
Але хто нам яе пакажа?
На дол вадой ці снегам ляжа?
Не вернешся, як хваля тая,
Ка мне, вясна ты маладая!..

Вось як цяпер, перада мною
Ўстае куточак той прыгожа,
Крынічкі вузенькае ложа
І елка ў пары з хваіною,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладыя ў час кахання,
Ў апошні вечар расставання.
І бачу лес я каля хаты,
Дзе колісь весела дзяўчаты
Спявалі песні дружным хорам,
З работ ідучы позна борам.
Нясліся зыкі песень здольных,
Ў лясах раз-пораз адбівалісь,
І ім узгоркі адклікалісь,
І радасць біла ў песнях вольных.
А хвоі, елкі векавыя
Пад зыкі песень маладыя
Маўчком стаялі ў нейкай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Няслось вячэрняе маленне
Ўгару, святое аддаленне.

**Вяд. 2** А зараз гучы, купалаўскае слова, ліся беларуская песня ў выкананні вучаніц 9 класа Шаўчэнка Паліны і Кубарскай Дзіяны

**Гучыць песня "Спадчына"**




**Вяд. 1** Як вядома, таленты заўсёды з'яўляюцца тады, калі ў іх ёсць патрэба. Янка Купала і Якуб Колас і творчасцю, і ўсім сваім жыццём пацвердзілі гэта.

**Вяд. 2** Яны ўзнялі паходню свайго мудрага слова на пераломе сацыяльных эпох, калі той-сёй ставіў пытанне: а ці ёсць такі народ — беларускі, а ці патрэбна мова такая — беларуская?

**Янка Купала "Сын і маці"**



**Сын** — Мамка, мамка, нам сягоння
Гаманілі ў школе
Аб якойсьці Беларусі,
Што жыве на волі.
Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Не люблю іначай),
Ды ніяк не мог уцяміць,
Што ўсё гэта знача.
**Маці** — А вось тое, мае дзеткі,
Глянь-зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў;
Сотні вёсак і мястэчак,
Гарадоў нямала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
З неапетай хвалай.
Там плывуць Дняпро і Сожа
Ды Дзвіна і Нёман,
Белавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.
Гарады — Мінск, Віцебск, Вільня,
Магілёў, Гародня
Аб вялікай нашай славе
Сведчаць на свет цэлы,—
Як жылі мы, панавалі
Ў родным краі смела.
Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
Й да цябе належа.
**Сын** А! Ужо сцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаю не буду.
Ну, а йшчэ скажы мне, мамка,
Бо я не разважыў:
Што такое беларусы,
Як настаўнік кажа?
**Маці**— Ах, які ты йшчэ дурненькі,
Каб не скеміць гэта!
Ну, паслухай: усе людзі,
Што ад лета ў лета,
Ад пакон вякоў жылі тут
І жывуць сягоння,
Носяць світкі, носяць лапці
Ды былі ў прыгоне,

Ўсе — і ты, і я, суседзі,
Хто, па-твойму, прусы?
Дык жа ўцям: на Беларусі
Жывуць беларусы!
Ды яшчэ, каб лепей ведаў,
Мушу табе ўспомніць:
Беларусы беларускай
Гутаркай гамоняць.
**Сын**
— Вось яно што! Праўда, мамка,
Ўжо сабе ўтлумачыў:
Беларус я! Ох, дам пытлю,
Хто скажа іначай.
Ну, але яшчэ не ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?
**Маці**
— Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?
Як жа мы з табой гуторым
Вось у гэту хвілю?
Як жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?
Ды паслухай, як на вёсцы
Кажа дзядзька, цётка;
Як пяюць улетку жнеі
За сваёй работкай;
Як бабуля баіць казкі
Аб нядолі-долі;
Як начлежнікі спяваюць
На начлезе ў полі?!
**Сын** — Ну, ўжо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу,
Пакажу я ўсяму свету,
Хто я дый што значу

**Вяд.1** Падзякуйце шчырымі апладысментамі Зубоўскай Ульяне і Качанаву Івану за цудоўнае прачытанне верша Я.Купалы “Сын і маці”

**Вяд. 2** Кожнаму чалавеку лёс адводзіць свой зямны куток, дае бясцэнны дар жыцця і святое адчуванне любові да блізкіх людзей. Паслухайце, з якім замілаваннем Якуб Колас расказвае пра свайго дзядзьку Антося. На сцэну запрашаюцца вучні 7 “В” класа



**Я.Колас “Дзядзька-кухар”**

Наш дзядзька, мілы наш Антоні,
Ў дзіцячым часта быў палоне;
Вось так гуртом яго абсядуць
І час работы яго крадуць;
Насі «катла», кажы ім казкі,
Ідзі на поплаў з імі ў краскі,
Давай адказы на пытанні,
Тлумач ты ім усё дазвання:
Адкуль, з чаго, дзе што бярэцца,
Вось гэта, тое як завецца
І чаму так, чаму не гэтак?
Прыхілен дзядзька быў да дзетак.
Ён быў настаўнікам, суддзёю,
Калі, бывала, між сабою
Паспорацць дзеткі ці паб'юцца,
Дык да каго тады звярнуцца,
Як не да дзядзькі, да Антося?
Ох, слаўна з дзядзькам ім жылося!
Яшчэ замецьце, што з малымі
Ён размаўляў, як са старымі,
І з імі радзіўся, спрачаўся —
Як роўны з роўнымі трымаўся!
Калі ж хто часам з ім не зладзіць,
То дзядзька толькі вус пагладзіць,
Але не скажа ён нічога,
Бо ведаў, чым данясць малога,—
Гаворыць з тым, з кім дзядзька ў згодзе:
— Калі такі ён, ну, то годзе! —
І дзядзька змоўкне, пачакае,
Кісет дастане і закурыць
І вочы чутачку прыжмурыць,
Як бы і ў памяці не мае
Таго, што з хлопцам пасварыўся.
— А як авёс наш урадзіўся?
Схадзіць бы ў Ліпава пабачыць! —
Ўжо знаюць дзеці, што то значыць
Гаворка дзядзькава такая,
Куды ён вуды закідае:
У Ліпава пайсці з ім! Божа!
І хто ўстаяць прад гэтым зможа?
Ды гэта ж — свята, ягамосці!
Набок тут норавы і злосці!
І мяккім робіцца паганы —
Хоць ты яго кладзі да раны.

**Вяд.1** Іх імёны вымаўляюцца заўсёды разам. Іх псеўданімы з народнага жыцця і фальклору. Калі Колас — зямля, дык Купала — неба над роднаю зямлёю, калі Колас — хлеб, дык Купала — песня.

**Вяд.2** Колас — цяпло роднага дому, Купала —трывога за родны край і за яго людзей. Купала і Колас — блізкія, але і розныя. Яны ў літаратуры застаюцца разам — удвух, як тыя "Дзве таполі" з песні на словы Я.Купалы.




**Выконваецца песня “Дзве таполі”**

**Вяд 1.** Нам у спадчыну ад Коласа і Купалы засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.

**Вяд 2.** Ці ведаеце вы, паважаныя сябры, што беларуская мова прызнана міжнароднай арганізацыяй ЮНЕСКА другой пасля італьянскай па меладычнай прыгажосці.

**Вяд.1** Давайце яшчэ раз пранікнемся шчымлівымі купалаўскімі радкамі ў выкананні Яскевіч Яны

**Я.Купала “Па захадзе”**

Мой міленькі прыйшоў ка мне
Па захадзе ўжо сонца
І ціха ў цёмнай цішыне
Пастукаўся ў аконца.
Заныла сэрцайка маё,
Як гэтае пачула,
Сваё зняла я акрыццё
І на зямлю ступнула.
Ў кашулі выйшла я на двор
Да любага з святліцы,
А неба рдзела ўжо ад зор,
Шумеў лес над крыніцай.
Шлі ветры: пелі пра красу,
Хісталі стан, любыя,
І расплятаw мне касу,
І ласкаталі шыю
На прызбе селі мы ўдваіх —
І моўчкі паглядалі,
Як цені з хат і пунь сівых
То ніклі, то ўставалі.
Мяне к сабе ён прыціскаў,
К грудзі туліўся белай,
Глядзеў у вочы, уздыхаў
І штось шаптаў нясмела.
Сляза жывая за слязой
З маіх зраніц сплывала,
Ў адно мяшалася з расой,
Што на пяску ляжала.
А ночка пела з бліскам зор
Нам смелы гімн кахання,
Смяяўся, плакаў сіні бор
Да самага світання.
І мілы выйшаў ад мяне,
Адзін пайшоў к пагонцы,
А ўслед за ім у цішыне
Ўзыходзіла ўжо сонца...




**Вяд.1** Як жа хораша гучыць мова Коласа і Купалы! Слухала і сэрца сціскалася: колькі замілавання і смутку, шчасця і жалобы, прыгажосці і сакавітасці ў ёй.

**Вяд. 2** Спадзяёмся, што і вы , паважаныя сябры, апынуўшыся сёння ў паэтычным акіяне беларускага слова , з вялікай любоўю і пашанай будзеце ставіцца да высокай мовы Коласа і Купалы.

**Разам**. Са святам роднай мовы, паважаныя беларусы!

